*І. М. ЯЗЭПЕНКА*

## ПРАБЛЕМЫ МУЗЕЕФІКАЦЫІ І ЗАХАВАННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАЛЕССЯ

*У мэтах папулярызацыі помнікаў археалогіі рэгіянальнага і нацыянальнага ўзроўняў і музеефікацыі пад адкрытым небам аўтарам публікацыі прапануецца абгрунтаванне праекта па стварэнні археалагічна-біялагічнага заказніка на поўначы Гомельскай вобласці.*

Помнікі археалогіі з'яўляюцца скарбніцай нацыянальнай і сусветнай культуры, яны выступаюць у якасці аднаго са складнікаў паняцця «гісторыка-культурная спадчына» і адносяцца да віду матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія патрабуюць комплекснага падыходу да іх вывучэння, аховы і выкарыстання. Статус помнікаў археалогіі, іх утрыманне, захаванне і функцыянаванне рэгламентуюць наступныя нарматыўныя акты: Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» ад 9 студзеня 2006 г. № 98-3, Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 мая 2002 г. № 651) і пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 762 «Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны».

Апошняе дзесяцігоддзе XX ст. і першае дзесяцігоддзе XXI ст., безумоўна, сталі паваротнымі ў справе распрацоўкі прававой базы і ўдасканалення заканадаўчых актаў, якія непасрэдна звязаны з захаваннем помнікаў археалогіі. Але стан захаванасці гэтых самых помнікаў з кожным годам выклікае ўсё большую занепакоенасць з боку прафесійных археолагаў Нацыянальнай акадэміі навук, універсітэцкіх цэнтраў краіны і музеяў. Асноўныя функцыі па ахове помнікаў археалогіі на месцах паводле заканадаўства ўскладзены на мясцовыя Саветы дэпутатаў, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўлады (арт. 10 Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»), рэальна ж на практыцы асноўны цяжар па ўліку і падрыхтоўцы тых ці іншых мерапрыемстваў па ахове археалагічных аб'ектаў нясуць на сабе супрацоўнікі краязнаўчых музеяў. Але далёка не ў кожным абласным цэнтры ў навуковым штаце ёсць людзі, якія праводзяць самастойныя археалагічныя даследаванні ці маюць вопыт удзелу ў археалагічных экспедыцыях, а значыць, у той ці іншай ступені могуць выступаць дасведчанымі кансультантамі ў галіне археалогіі для супрацоўнікаў сельскіх Саветаў, прыродаахоўных інспекцый, лясніцтваў і землеўпарадкавальных службаў.

Сярод помнікаў археалогіі на сёння найбольш разбураюцца курганныя могільнікі ранняга Сярэднявечча, прычым крыўдна тое, што знішчэнне гэтага віду археалагічных крыніц і страта іх для навукі адбываюцца перш за ўсё пад уздзеяннем негатыўнага чалавечага фактару. Прыкладаў шмат. Толькі падчас адной паездкі ў ліпені 2007 г. з мэтай паўторнай рэгістрацыі і высвятлення стану захаванасці помнікаў археалогіі на тэрыторыі Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці прыйшлося зафіксаваць наступнае: 1) в. Гарбачоўка – больш за 40 курганных насыпаў, да 1/3 пашкоджаны рабаўніцкімі калодзежамі (помнік не значыцца ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь); 2) в. Эрд – тры курганныя групы, у адной з іх многія курганныя насыпы пашкоджаны (у Дзяржаўным спісе ўлічана толькі адна група, шыфр 313В000330); 3) в. Даліна – з 17 курганоў 6 пашкоджаны (шыфр 313В000297 паводле Дзяржаўнага спіса); 4) в. Чорная Вірня (ур. Мышалоўка) – 14 насыпаў, да паловы з іх разбураны (шыфр 313В000321) – і так па кожным курганным могільніку, іх, згодна з Дзяржаўным спісам, на тэрыторыі Жлобінскага раёна налічваецца 12, на самай справе не менш 22 [3, с.28–34]. Аналагічная неадпаведнасць існуе паміж данымі Дзяржаўнага спіса і інфармацыяй, якая змешчана ў кнізе «Памяць» па Рагачоўскаму раёну Гомельскай вобласці. Так, па спісе помнікаў, якія маюць статус гісторыка-культурных каштоўнасцей, прыведзена 40 [1, с.280–284], прычым акцэнт зроблены ў асноўным на гарадзішчы і курганныя могільнікі. Стаянак каменнага веку толькі 3, але яшчэ падчас археалагічных даследаванняў 1950-х гг. І. І. Арцёменкі толькі ў ваколіцах адной в. Лучын іх налічвалася не менш 9. Апроч таго, абсалютна адсутнічае інфармацыя пра курганныя могільнікі эпохі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бронзы каля в. Ходасавічы, самыя старажытныя ў Беларусі [4, с.23–24]. Такім чынам, толькі ў межах двух раёнаў Гомельскай вобласці застаюцца няўлічанымі не менш як 30 помнікаў археалогіі розных перыядаў, якія не маюць статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. З усім тым не менш 6 з іх заслугоўваюць аднясення як мінімум да другой катэгорыі нацыянальнай значнасці.

Для больш дзейснага ўліку і кантролю за ўтрыманнем і выкарыстаннем помнікаў археалогіі рэгіянальнага і нацыянальнага ўзроўняў, іх папулярызацыі і музеефікацыі пад адкрытым небам аўтарам публікацыі прапануецца навуковае абгрунтаванне праекта па стварэнні на поўначы Гомельскай вобласці археалагічна-біялагічнага заказніка.

*1. Тэрыторыя,* прапанаваная для стварэння археалагічна-біялагічнага заказніка, уключае левабярэжную пойму Дняпра і прылеглыя ўчасткі надпойменнай тэрасы, адрэзкі рэчышчаў Дняпра і Друці са шматлікімі старычнымі азёрамі. Агульная плошча вагаецца ад 36 да 50 кв. км. Працягласць тэрыторыі ўздоўж берагоў Дняпра каля 12 км, максімальная шырыня 4 км. Адносныя адзнакі вышынь у межах гэтай плошчы вагаюцца ад 125 да 141 м. На тэрыторыі, якая плануецца пад заказнік, істотную ролю адыгрываюць як прыродныя, так і археалагічныя аб’екты. Большасць з іх адносіцца да неаліту і ранняга перыяду эпохі бронзы (4–2 тыс. да н. э.), таксама налічваецца не менш як 5 умацаваных паселішчаў (гарадзішчаў), на якіх зафіксаваны культурныя напластаванні ранняга жалезнага веку і Сярэдневякоўя.

Месцазнаходжанне прапанаванага заказніка – поўнач Гомельскага Палесся, тэрыторыя Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці, у 121 км на ПнЗ ад Гомеля. Найбольш блізкія населеныя пункты – горад Рагачоў, вёскі Лучын, Збароў, Вікоў і Ходасавічы.

*2. Прыродныя аб’екты.* Тэрыторыя заказніка вызначана ў Прыдняпроўскай нізіне Гомельскага Палесся [2, с.19–20]. У перыяд адступлення дняпроўскага і сожскага ледавікоў тут існавала прыледавіковае возера, у якім накопліваліся пяскі і супяскі. Паверхня рэльефу палогахвалістая, з нахілам на поўдзень. Ваганні адносных вышынь да 16 м. Пойма ў асноўным асіметрычная левабярэжная ад 2 да 3 км у шырыню. Па пойме размяшчаюцца шматлікія дзюны (выдмы) і астанцы надпойменнай тэрасы Дняпра. Вышыня іх вагаецца ад 1,5 да 3,5 м над межанем вады ў рэках і старычных азёрах.

Найбольш буйнымі воднымі аб’ектамі разглядаемай тэрыторыі з’яўляюцца рэкі Днепр і Друць, якія зліваюцца крыху на поўдзень ад Замкавай гары. Акрамя гэтага, рэчышча Дняпра пакінула шмат старыц, самыя буйныя з іх – Камарын, Добрае (Святое), Сасонка, Прорва левабярэжныя.

На тэрыторыі санаторыя «Прыдняпроўскі» знаходзіцца вядомы геалагічны разрэз (агаленне) – помнік прыроды рэспубліканскага значэння Чырвоная горка (в. Збароў), які займае плошчу 0,01 га [2, с.147].

*Глебы.* У разглядаемай частцы Гомельскага Палесся распаўсюджаны супясчаныя глебы (па тэрасах і карэнным беразе) і пойменныя (алювіяльныя), пойменна-дзярновыя глебы (на поплаве), падвержаны воднай і ветравой эрозіі [2, с.101].

*Флора.* На прапануемай тэрыторыі заказніка пераважаюць сасновыя тэрасныя лясы, але сустракаюцца ў пойме невялічкія ўчасткі нізінных дубраў і на астанцах поймы – змешаных лясоў; распаўсюджана расліннасць заліўных лугоў [2, с.115].

*3. Археалагічныя аб’екты.*

*а) Стаянка фінальнага палеаліту-мезаліту (Збароў 2).* Паселішча адкрыта А. М. Рыкуновым у 1974 г. Культурны пласт разбураны ворывам і ветравой эрозіяй. Але па самым краі надпойменнай тэрасы захаваліся ўчасткі, на якіх можна праводзіць археалагічныя раскопкі. Размешчана паселішча на першай надпоплаўнай тэрасе левага берага Дняпра на вышыні 8–10 м над межанем вады ў рацэ, праз 0,2 км на паўночны ўсход ад вёскі Збароў. Тыпалагічныя характарыстыкі археалагічнай калекцыі, сабранай падчас паверхневых збораў на тэрыторыі помніка (1941 артэфакт), дазволілі датаваць месцазнаходжанне часам ранняга мезаліту (днепра-дзяснінская культура), а самая ранняя дата, магчыма, прыпадае на фінальны палеаліт, позні этап культуры Броме-Лінгбі, позні дрыас (10800–10300 гадоў назад) [9; 10].

*б) Паселішчы неаліту Сасонка, Завалле (Узвалле), Барок Сямёнаўскі (Борак Семінаўскі), Іванскае (Івенскае), Барок, Дзеднае, Мошка, Палік, Харшова (даследаванні І.І. Арцёменкі) і Прорва 2, Прорва 4, Камарын 2, Камарын 5, Дзядкоў Борак (новыя неалітычныя паселішчы, якія сталі вядомы толькі пачынаючы з 1994 г., дзякуючы даследаванням І. М. Язэпенкі).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да канца 1960-х гг. на разглядаемай тэрыторыі, дзякуючы маштабным работам пад кіраўніцтвам І. І. Арцёменкі, было вядома 9 неалітычных стаянак, на якіх праводзіліся археалагічныя раскопкі. На сёння неалітычных помнікаў на гэтай тэрыторыі налічваецца не менш як 30. На 6 новых неалітычных стаянках праводзіліся шматгадовыя палявыя даследаванні пад кіраўніцтвам М. М. Крывальцэвіча і І. М. Язэпенкі. У ходзе гэтай працы ўпершыню для Падняпроўя Беларусі былі атрыманы абсалютныя даты, якія дазволілі ўдакладніць храналагічныя межы позніх этапаў днепра-данецкай неалітычнай культуры. Самы перспектыўны ўчастак для будучай работы комплексных экспедыцый – левабярэжная пойма Дняпра ад старычнага возера Камарын да старычнага возера Сасонка. Вельмі істотна, што ўсе пойменныя неалітычныя паселішчы не закрануты антрапагенным уздзеяннем. На некаторых з іх можна прасачыць чатыры, а то і пяць этапаў засялення. Асабліва важным можа быць той фактар, што гэтыя помнікі могуць стаць эталоннымі ў плане вывучэння пераходу ад адной эпохі – неаліту да другой – ранняга перыяду бронзавага веку [13–17].

*в) Грунтовы могільнік эпохі бронзы (Прорва 1 – даследаванні пад кіраўніцтвам М. М. Крывальцэвіча).*

Унікальны пахавальны комплекс, падобны грунтовы могільнік на тэрыторыі Беларусі вывучаўся больш як 30 гадоў таму назад. Не выключана, што ёсць вельмі вялікая верагоднасць адкрыцця аналагічных помнікаў на разглядаемай тэрыторыі, аб гэтым сведчаць адзіночныя пахаванні на пойменных узвышэннях Камарын 2, Прорва 2, Палік. Матэрыялы і закрытыя комплексы з Прорвы 1 далі падставы змяніць падыход да перыядызацыі сярэднедняпроўскай культуры і эпохі бронзы на Беларускім Падняпроўі [8].

*г) Курганныя пахаванні эпохі бронзы Ходасавічы-Палік, Ходасавічы-Мошка (старычнае возера Добрае), Ходасавічы-Каменнае, Ходасавічы-Дзеднае, Ходасавічы-Сяргеева Грыва, Камарын 2 (даследаванні І. І. Арцёменкі і М. М. Крывальцэвіча).*

Непаўторнасць тэрыторыі ў ваколіцах вёсак Ходасавічы і Лучын заключаецца ў тым, што толькі тут выяўлены самыя старажытныя курганы на Беларусі. Курганы ва ўрочышчы Мошка і па берагах старычных азёр Дзеднае і Каменнае знойдзены Ю. В. Кухарэнкам у 1951 г. У 1959–1966 гг. І. І. Арцёменкам раскапана 29 курганоў з 64 пахаваннямі, з іх 41 пахаванне – эпохі бронзы, а 23 – XI–XIII стст. М. М. Крывальцэвічам даследаваліся курганныя пахаванні Камарын 2 і на беразе старычнага возера Каменнае [5].

*д) Замкавая гара, Замак каралевы Боны (Рагачоўскае гарадзішча)* – займае край мыса, вышыня 11–12 м, каля сутокаў Друці з Дняпром. Пляцоўка памерам 125х90 м, блізкая да трохвугольнай формы, ад карэннага берага аддзелена ровам шырынёй больш за 40 м, з трох бакоў гарадзішча абаронена высокімі стромкімі схіламі. Выявіў у 1855 г. М. В. Без-Карніловіч. Даследавалі ў 1966–67, у 1973, 1975–76 гг. П. Ф. Лысенка і Э. М. Загарульскі. Першыя пасяленцы на тэрыторыі гарадзішча з'явіліся ў 3 тыс. да н. э. У 1 тыс. да н. э. тут узнікла ўмацаванае паселішча (гарадзішча) жалезнага веку. Культурны пласт да 1,3 м не захаваў арганічных рэштκаў. Сярэдневяковае паселішча на Замкавай гары ўзнікла, на думку П. Ф. Лысенкі, у XI ст. Рагачоў упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1142 г. пры апісанні раздачы кіеўскім князем Усеваладам Ольгавічам сваім братам гарадоў Тураўскай і Уладзімірскай зямель, адсюль меркаванне аб прыналежнасці да Тураўскай зямлі. З канца XIII ст. у складзе ВКЛ, з 1509 г. належаў вялікаму князю, кіраваўся старостам. З 1567 г. узгадваецца як умацаваны замак, спалены ў 1654 г., канчаткова знішчаны да 1780 г. [6].

*Задруцкае гарадзішча* размешчана на паўднёвай ускраіне прыгарада Рагачова, на правым беразе Дняпра. Усходні схіл стромкі, вышыня 17–18 м. З супрацьлеглага боку ўмацавана валам вышынёй 1–3 м, шырынёй ад 8 да 15 м. У 1893 г. на гарадзішчы ў гліняным гаршку знайшлі 89 цэлых і 3 фрагментаваныя сярэбраныя грыўні – зліткі агульнай масай 14,5 кг, схаваныя ў XIII ст. Гэта самы буйны скарб з грашовых знакаў безманетнага перыяду, знойдзеных на Беларусі. Імператарская археалагічная камісія ў Пецярбургу размеркавала скарб паміж музеямі Пецярбурга, Масквы, Разані, Арла, Ноўгарада, Херсона, Берлінскага Каралеўскага нумізматычнага камітэта, Пенсільванскага ўніверсітэта (ЗША) і распрадала прыватным калекцыянерам. У 1929 г. Дзяржаўная акадэмія гісторыі матэрыяльнай культуры перадала 13 зліткаў Эрмітажу [12].

*Лучынскія гарадзішчы.* Лучын – адна з самых найстаражытнейшых вёсак у Беларусі. Упершыню ўзгадваецца ў летапісе пад 1136 г. Лучын з'яўляўся смаленскім фарпостам на Дняпры, размешчаным на мяжы з Турава-Пінскім княствам. У Лучыне знаходзяцца два

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

добра ўмацаваныя гарадзішчы. Адно з іх на паўночнай ускраіне вёскі ва ўрочышчы Папова Гара. Пляцоўка памерам 120х50 м, умацавана падкowападобным валам да 3 м вышынёй і шырынёй 19–20 м у аснове. У культурным пласце таўшчынёй ад 0,5 м у цэнтры пляцоўкі і да 1,2–1,6 м па краі знойдзены ляпная кераміка ранняга жалезнага веку (мілаградская і зарубінецкая культуры), ганчарная кераміка XI–XIII стст., рэшткі шкляных бранзалетаў, вырабы з жалеза і бронзы. Другое гарадзішча – за 50–70 м на ПнЗ ад вёскі. Пляцоўка памерам 85х90 м, з усходу абмежавана высокім (каля 10 м) крутым берагам Дняпра, з поўдня – ярам, з захаду і поўначы ўмацавана валамі і равамі. Вышыня ўнутранага вала каля 4,5 м, шырыня ў аснове каля 16 м, вышыня вонкавага вала 2,3 м, шырыня ў аснове каля 12 м. Паміж валамі роў глыбінёй 4,5 м, шырынёй каля 17 м [7].

*Збароўскае гарадзішча.* Размешчана праз 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Збароў. Займае край левабярэжнай надпойменнай тэрасы Дняпра, вышыня над узроўнем поймы 17–18 м. Пляцоўка паўкруглай формы памерам 56х80 м. З паўночна-ўсходняга боку пляцоўку абмяжоўвае круты, абрывісты бераг ракі, з захаду – глыбокі яр. З напольнага боку гарадзішча ўмацавана падкowападобным валам вышынёй 2–3 м і шырынёй 10–15 м. З вонкавага боку вала назіраецца роў шырынёй каля 1–5 м і глыбінёй 2,5–3 м. Культурны пласт таўшчынёй 0,6 м у цэнтры пляцоўкі і да 1,6 м каля вала. Помнік вядомы з 1873 г. Абследаваўся ў 1931 г. А. М. Ляўданскім, у 1976 г. – А. Р. Мітрафанавым. У 1967–1968 гг. Г. Ф. Салаўёва раскапала 473 кв.м плошчы помніка. Вылучаны тры розначасовыя гарызонты: эпохі Сярэдневякоўя, ранняга жалезнага веку і эпохі бронзы. У 1998 г. у паўднёвай частцы праводзіліся раскопкі (60 кв.м) пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў Гомельскага абласнога краязнаўчага музея А. М. Драбушэўскага і А. М. Штыменкі. Сярод знаходак самымі выразнымі з’яўляюцца: наканечнікі дзідаў і стрэл, сярэбраныя пярсцёнкі, крыж-энкалпіён, фрагменты ліцейных форм і абломак меднай (бронзавай) раманскай (заходнееўрапейскай) чашы пачатку XII ст. з лацінскім надпісам і выяваю жанчыны. Час функцыянавання Збароўскага замка вызначаецца ў межах XII–XIII стст. [11].

Думаецца, стварэнне археалагічна-біялагічнага (археалагічна-ландшафтнага) заказніка на тэрыторыі Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці павінна надаць новы, нестандартны імпульс для распрацоўкі рэгіянальнай праграмы па ахове і папулярызацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, будзе садзейнічаць развіццю цэласнага і комплекснага падыходу да помнікаў археалогіі не толькі як да аднаго з відаў матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, але і як аб’екта ў працэсе стварэння і станаўлення новага тыпу музеяў – музеяў пад адкрытым небам.

1. *Дзяржаўны* спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; скл. В. Я. Абламскі [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2009. – 684 с.: іл.

2. *Нацыянальны* атлас Беларусі / Камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2002. – 292 с.

3. *Памяць:* гіст.-дакум. хроніка Жлобіна і Жлобінскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2000. – 752 с.

4. *Памяць:* гіст.-дакум. хроніка Рагачоўскага раёна / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1994. – 535 с.

5. *Артеменко, И. И.* Неолитические стоянки и курганы эпохи бронзы близ с. Ходосовичи Гомельской области БССР / И. И. Артеменко // Памятники каменного и бронзового веков Евразии: сб. ст. / АН СССР, Ин-т археологии; отв. ред. О. Н. Бадер. – М.: Наука, 1964. – С. 31–84.

6. *Ваганава, А. М.* Рагачоў / А. М. Ваганава // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993.– С. 529.

7. *Калечыц, А. Г.* Лучын / А. Г. Калечыц, А. Р. Мітрафанаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993.– С. 377–378.

8. *Крывальцэвіч, М. М.* Могільнік сярэдзіны III – пачатку II тысячагоддзя да н. э. на Верхнім Дняпры – Прорва 1 / М. М. Крывальцэвіч; НАН Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск, 2006. – 202 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Ксензов, В. П.* Мезолитическое поселение Зборов 2 на Днепре / В. П. Ксензов, А. Н. Рыкунов, И. Н. Езепенко // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі АН Беларусі; укл. М. І. Лашанкоў. – Мінск, 1995. – № 7. – С. 3–12.

10. *Ксензов, В. П.* Новые материалы каменного века из окрестностей д. Зборов Рогачевского района Гомельской обл. / В. П. Ксензов, А. Н. Рыкунов, И. Н. Езепенко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; укл. А. М. Мядзведзеў, І. М. Язэпенка. – Мінск, 2001. – Вып. 3. – С. 44–56.

11. *Мітрафанаў, А. Р.* Збароў / А. Р. Мітрафанаў // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993. – С. 271.

12. *Рабцэвіч, В. Н.* Задруцкі манетны скарб / В. Н. Рабцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993.– С. 259.

13. *Язэпенка, І. М.* Да пытання аб інтэрпрэтацыі матэрыялаў неалітычных паселішчаў Беларускага Падняпроўя / І. М. Язэпенка // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі АН Беларусі; укл. М. І. Лашанкоў, А. А. Мяцельскі. – Мінск, 1994. – № 3. – С. 10–26.

14. *Язэпенка, І. М.* Матэрыялы паселішча ва ўрочышчы Сасонка і яго месца ў неаліце Верхняга Падняпроўя / І. М. Язэпенка // Гістарычна-археалагічны зборнік / Ін-т гісторыі АН Беларусі; укл. М. І. Лашанкоў. – Мінск, 1995. – № 7. – С. 60–82.

15. *Язэпенка І. М.* Днепра-данецкая культура ў басейне Верхняга Дняпра / І. М. Язэпенка // Старажытнасці Рагачоўшчыны: зб. арт. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі; Рагачоўскі краязнаўчы музей; навук. рэд. А. М. Мядзведзеў. – Мінск; Рагачоў, 2000. – С. 14–26.

16. *Язэпенка, І. М.* Даследаванні 2000 года на паселішчы Дзядкоў Борак / І. М. Язэпенка // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2003. – Вып. 6. – С. 47–61.

17. *Язэпенка, І. М.* Паселішча эпохі неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Борак Семінаўскі (вынікі даследаванняў 2000–2001 гадоў) / І. М. Язэпенка // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 11. – С. 20–43.

*I. YAZEPENKA*

**PROBLEMS OF MUSEUMFICATION AND PRESERVATION OF THE ARCHEOLOGICAL MONUMENTS ON THE TERRITORY OF GOMEL POLESIYE**

With the aim of the archeological monuments of regional and national levels' popularization and the museumfication in the open air the author of the publication proposes the justification of the project on the foundation of the archeologically-biological preserve in the north of Gomel region.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 03.10.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ